# “МЫ — БЕЛАРУСЫ!!”

Велічным кульмінацыйным акордам фіналу Рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі “Мы — беларусы!” сёння стане выкананне Дзяржаўнага гімна краіны. Магутны спеў артыстаў Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору імя Генадзя Цітовіча, Дзяржаўнага камернага хору і капэлы “Санорус” разам з тысячамі і тысячамі мінчан — гледачоў унікальнага гала-канцэрта пралунае над вялізным спеўным полем, у якоеператворыцца на пяць гадзін узлётная паласа аэрапорта “Мінск-1”. Залатыя галасы годна сцвердзяць: “Мы — беларусы!”

**Сёння з аэрапорта “Мінск-1” у неба адна за адной будуць узлятаць... песні: на гэтай пляцоўцы адбудзецца заключны канцэрт Рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі “Мы — беларусы!”. Ён працягнецца каля пяці гадзін. А дамінантай канцэрта, паводле традыцыі, стане сумеснае выкананне гімна нашай краіны.**

— У выкананні гімна, — расказаў рэжысёр канцэрта Вячаслаў Панін, — возьмуць удзел тры нашы буйныя калектывы: Нацыянальны акадэмічны народны хор імя Генадзя Цітовіча пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, прафесара Міхася Дрынеўскага, капэла “Санорус” на чале з Аляксеем Шутом, Дзяржаўны камерны хор пад кіраўніцтвам Наталлі Міхайлавай. Вядома, да іх далучыцца і публіка. Так што склад “зводнага хору” ў 300 чалавек — далёка не мяжа.

Пляцоўка аэрадрома разлічана на 10 — 15 тысяч чалавек — чым не прастора для “спеўнага поля”? Тым больш, што традыцыі харавой музыкі заўсёды развіваліся ў нашай краіне даволі плённа.

Трэба спадзявацца, будуць падпяваць гледачы і многім сольным выступленням нашых вядомых артыстаў. Тым больш, што праграма канцэрта збярэ ледзь не ўвесь эстрадны “бамонд”, многія маладыя гурты і асобных салістаў, юных зорачак і замежных гасцей.

— З Расіі, — працягвае В.Панін, — мы запрасілі папулярную групу “Сцэнакардзія”. Яна добра вядомая беларускім гледачам не толькі па тэлеэкране, бо ўдзельнічала ў Міжнародным фестывалі мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”, у многіх іншых гала-канцэртах, што праходзілі ў нашай краіне. Ну, а Анжаліку Агурбаш назваць “замежнай госцяй” проста немагчыма. Яна хаця і жыве апошнім часам у Расіі, усё роўна — “Беларусачка”, як называўся, дарэчы, адзін з яе альбомаў, цалкам складзены з песень нашых аўтараў. Моцным абяцае быць і дзіцячы блок. У ім выступіць ансамбль “Верасяты”, пераможцы і ўдзельнікі дзіцячага “Еўрабачання” Ксенія Сітнік, Аляксей Жыгалковіч, Вольга Сацюк. Канцэрт разлічаны на рознаўзроставую аўдыторыю. У ім возьмуць удзел такія выдатныя салісты, як народныя артысты Беларусі Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, Іна Афанасьева, заслужаныя артысты краіны Ірына Дарафеева, Якаў Навуменка, лаўрэат міжнародных конкурсаў Паліна Смолава, улюбёнка публікі Ларыса Грыбалёва. Ды ўсё ж нашым галоўным арыенцірам была і застаецца моладзь. Таму акрамя ўжо даўно прызнаных эстрадных зорак мы запрасілі да ўдзелу і тых, хто пачаў сваю творчую кар’еру адносна нядаўна. Тым больш, што ўзрост артыстаў, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кажуць, зусім не перашкаджае іх папулярнасці. Думаю, выступленні Жанет, удзельнікаў эстраднай студыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў будуць садзейнічаць яшчэ большаму іх прызнанню нашай публікай. Не абышлі мы ўвагай і маладзёжныя гурты: “Lite sound”, “Палац”, “Да Вінчы”, “The Champions” і іншыя. Усяго ў канцэрце прагучыць каля 50-ці нумароў.
Што да “культураўцаў”, дык нам асабліва прыемна бачыць сярод удзельнікаў гурт “Пяты сезон”: гэты малады калектыў, які гучна заявіў пра сябе на песеннай эстрадзе, прадстаўляў нашу газету на XII Міжнароднай спецыялізаванай выстаўцы “СМІ ў Беларусі”, удзельнічаў у іншых гала-канцэртах, у тым ліку тых, што праходзілі ў межах Рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі “Мы — беларусы!”.
Сённяшні канцэрт у аэрапорце з’яўляецца фінальным. Акцыя пачалася ў сакавіку. Пасля невялікага жнівеньскага перапынку распачаўся другі яе этап. Сімвалічна, што пачатак яе другога этапа прыпаў на Дзень беларускага пісьменства, што сёлета святкаваўся ў Барысаве. Далей канцэрты акцыі ахапілі ўсе абласныя цэнтры рэспублікі, часам спалучаючыся з фестывальным рухам, святамі гарадоў, як гэта адбылося, да прыкладу, у Гомелі і Гродне.

— Падобныя канцэрты, — падзяліўся ўражаннямі прадзюсер Юрый Саваш, — ладзіць лёгка і адначасова складана. Лёгка таму, што на іх збіраюцца лепшыя артысты, кожны з іх добра разумее адказнасць і шчыра хоча зрабіць свой унёсак у фарміраванне нацыянальнай свядомасці нашага народа, чарговы раз з гонарам заявіўшы: “Мы — беларусы!”. А складанае, мабыць, тое, што ты і сам разумееш адказнасць, тым больш, калі канцэрт ладзіцца ў фармаце “жывога гуку”. Асабіста я браў удзел у арганізацыі двух гала-канцэртаў акцыі: самага першага, які ладзіўся ў сакавіку ў Магілёве, і нядаўняга ў Гомелі, якім завяршаўся V Міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва “Сожскі карагод”. Акрамя таго, у межах акцыі праходзілі многія сольныя канцэрты Тэатра песні Ірыны Дарафеевай. Уласна кажучы, кожнае выступленне нашых артыстаў і ў роднай краіне, і за яе межамі сведчыць пра тое, што “Мы — беларусы!”. Але калі гэтыя словы становяцца лозунгам, яны набываюць дадатковае выхаваўча-патрыятычнае ўздзеянне.

**Надзея БУНЦЭВІЧ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ